ДУК «Ваўкавыская раённая бібліятэка»
Філіял Роская гарпасялковая бібліятэка

# Навукова-папулярная серыя «Самыя – самыя»



2020

**Серыя «Самыя – самыя» заснавана ў 2017 годзе для малодшага школьнага ўзросту рэспубліканскім ўнітарным прадпрыемствам «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі».**



**«Самыя самыя»–незвычайная серыя пазнавальных кніг. Проста і захапляюча кнігі раскажуць аб розных накірунках чалавечых ведаў, дадуць адказы на шматлікія пытанні, навучаць быць уважлівымі і назіральнымі. Яны дапамогуць даведацца пра самых незвычайных, аб самых загадкавых, аб самых-самых… А прыгожыя ілюстрацыі і розныя заданні зробяць гэты працэс не толькі пазнавальным і цікавым, але і па-сапраўднаму займальным.**



**Глыбокія, моцныя, паўнаводныя... Рэкі Беларусі:** для мал. шк. узросту/ склад. С.Г.Дзявяткава. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі, 2019. — 24 с.: іл. — (Самыя-самыя).






**Без рэк немагчыма ўявіць жыццё на нашай планеце. Яны забяспечваюць нас прэснай вадой і рыбай, дапамагаюць перавозіць грузы, весці сельскую гаспадарку і здабываць энергію. Пра самыя доўгія, вялікія, паўнаводныя, глыбокія, казачныя і прыгожыя рэкі свету – ад Ніла да Амазонкі, ад Конга і Янцзы да Прыпяці і Дняпра – расказвае гэта кніга.**

**Дацягнуцца да нябёсаў:** для мал. шк. узросту/ склад. Э.І.Гарошка. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 24 с. : іл. –(Самыя-самыя).




**Дзякуючы развіццю тэхналогій па ўсім свеце будуюцца небаскробы, якія ўражваюць сваёй вышынёй і тэхнічнай навізной. Кніга пазнаёміць юных чытачоў з «самымі-самымі» будынкамі Беларусі — самымі высокімі, самымі знакамітымі, самымі арыгінальнымі, а таксама з іншымі дзіўнымі збудаваннямі, якія існуюць на нашай планеце.**



**Дзяваткава, С.Г. Вялікія, магутныя, хуткія. Машыны:** для мал. шк. узросту/ С.Г.Дзяваткава. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 32 с.: іл. – (Самыя-самыя).






**У кнізе расказваецца пра самыя адмысловыя і незвычайныя грузавыя, спецыяльныя і легкавыя аўтамабілі. Самы вялікі ў свеце беларускі самазвал БелАЗ – 75710, які ўключаны ў Кнігу рэкордаў Гінеса, самы хуткі грузавік на планеце, самы доўгі аўтацягнік, самы дарагі і самы маленькі легкавыя аўтамабілі – вось далёка не поўны пералік таго, аб чым даведаюцца юныя чытачы.**

**Дзевяткава, С.Г. Дрыгва - куток дзівосаў :** для мал. шк. узросту/ С.Г.Дзевяткава. - Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. - 24 с.: іл. - (Самыя-самыя).






**У кнізе апісваецца незвычайны, прыгожы свет балот, на якіх можна ўбачыць рэдкія расліны, птушак і звяроў. Раказваецца таксама пра карысць балота. Яно і санітар (ачышчае паветра), і скарбніца розных старажытных рэчаў, і крыніца такога карыснага выкапню, як торф. З балотам звязана шмат розных міфаў, казак, гераічных і фантастычных гісторый.**

**Дзяваткава,С.Г. Самыя незвычайныя помнікі:** для мал. шк. узросту/ С.Г.Дзяваткава. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. — 24 с.: іл. — (Самыя-самыя).






**У ілюстраванай кнізе расказваецца пра помнікі і скульптуры, створаныя майстрамі для добрага настрою і ўсмешак. А гэта, напрыклад, застылыя ў розных матэрыялах выявы звяроў і птушак, літаратурных герояў, прадукцыя, якую выпускаюць заводы, і майстры, якія ўслаўляюць свае мястэчкі, персанажы з нашага жыцця і многае іншае.**

**Дзяваткава, С. Г. Унікальныя лясы свету і Беларусі:** для мал. шк. узросту/ С.Г.Дзяваткава. - Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. - 24 с.. - (Самыя-самыя).






**У ілюстраванай кнізе расказваецца пра ўнікальныя лясы Зямлі: самыя вялікія, старажытныя, высокія, казачныя, у ліку якіх трапічныя лясы Амазонкі, сібірская тайга, загадкавы найстарэйшы і самы вялікі лес у цэнтры Еўропы Белавежская пушча, другі па памеры лясны масіў Беларусі Налібоцкая пушча і іншыя.**

**Лябедзька, У. М. Пчолы-рэкардсмены**: для мал. шк. узросту/ У.М.Лябедзька. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 32 с.: іл. – (Самыя-самыя).






**У кнізе сабраны цікавыя факты пра рэдкіх і незвычайных прадстаўнікоў вялікай сям’і сапраўдных пчол. Пчала-цясляр, занесеная ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, і пчала-кукушка, што жыве ў далёкай Аўстраліі, гіганты і карлікі ў царстве пчол, самыя старажытныя і самыя небяспечныя пчолы…**
**Пра іх цікаўны чытач даведаецца са старонак гэтай кніжкі.**

**Преданные, умные, красивые. Собаки:** для мл. шк. возраста/ сост. Т.И.Жуковская. – Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. –– 32 с.: ил. – (Самые-самые).






**В книге читатели узнают, какая служебная порода собак является самой популярной в Беларуси, у какой породы самые длинные уши, самые большие глаза, как называется самая древняя порода собак, чем отличается маламут от хаски, какую собаку китайцы называют бесценной... Издание будет интересно всем любителям живой природы.**

**Салавей І. А. Буры гаспадар лясоў :** для мал. шк. ўзросту/ І.А.Салавей. - Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. - 32 с. : іл. - (Самыя - самыя).




**У кнізе сабраны цікавыя факты пра бурага мядзведзя, а таксама пра іншых прадстаўнікоў сямейства мядзведжых. Чытач даведаецца, як называлі гаспадара лясоў нашы продкі, па якіх прыкметах можна вызначыць яго прысутнасць, дзе жыве самы маленькі мядзведзь, на якім кантыненце мядзведзяў няма наогул, дзе і калі існавала знакамітая "мядзведжая акадэмія".**



**Саўчук, С. С. Старажылы, волаты і монстры:** для мал. шк. узросту/ С.С.Саўчук, Л.У.Саўчук. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – 32 с.: іл. – (Самыя-самыя).






**У кнізе сабраны факты пра самыя цікавыя і незвычайныя дрэвы свету. Беларускі старажыл Цар-дуб, якому больш за 800 гадоў, самае высокае ў свеце, самае прыгожае, самае калючае і самае ядавітае дрэвы – вось далёка не поўны пералік таго, аб чым даведаюцца юныя чытачы.**

**Сахвон, В.В. Птушыны калейдаскоп :** для мал. шк. узросту / В.В.Сахвон. - Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. - 32 с. : іл. - (Самыя - самыя).






**З кнігі чытачы даведаюцца пра самую вялікую і самую маленькую птушку ў нашай краіне, а таксама пра найбольш адметных птушак свету: самую хуткую , самую цяжкую лятаючую птушку, самую нябяспечную і іншых. Выданне зацікавіць усіх аматараў птушак.**

**Чыстыя, глыбокія, прыгожыя...Азёры Беларусі**: для мал. шк. узросту/ склад. Т. І. Жукоўская. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. — 32 с.: іл. — (Самыя-самыя).






**З кнігі чытачы даведаюцца, якое возера называюць «беларускім морам», а якое лічаць найпрыгажэйшым у краіне, чым адметныя самае глыбокае і самае чыстае сярод азёр Беларусі. Кніга таксама пазнаёміць з рознымі незвычайнымі азёрамі свету: самым маленькім, самым гарачым, ружовым, плямістым і інш. Выданне будзе цікавым для ўсіх аматараў прыроды.**

# Запрашаем у Роскую гарпасялковую бібліятэку!



